ЯК СЁЛЕТА ПРАХОДЗІЎ ПРЫЗЫЎ 4

НЕКАЛЬКІ ГАДЗІН У РАДДОМЕ 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

24 ЛІСТАПАДА 2018 г. СУБОТА № 227 (28843)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«Даступнасць лекавых прэпаратаў для беларусаў павышаецца з году ў год за кошт развіцця нацыянальнай фарміндустрыі і ўдасканалення сістэмы закупак, а таксама павелічэння бюджэтнага фінансавання на закупку. За апошнія дзесяцігоддзі бюджэтныя асігнаванні на барацьбу з ВІЧ/СНІДам, гепатытам С, туберкулёзам павялічаны больш чым у тры разы. У 2018 годзе ўжо 86 % фінансавых сродкаў на закупку антырэтравірусных прэпаратаў забяспечаны за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Разумеючы важную ролю забеспячэння доступу пацыентаў да лекавых прэпаратаў належнай якасці, мы ідзём шляхам развіцця нацыянальнай фарміндустрыі».

БУДАВАЦЬ — НЕ ГАРАВАЦЬ

Вынікі семінара-нарады ў Прэзідэнта аб павышэнні эфектыўнасці будаўнічага комплексу

Да вялікай сустрэчы ў Палацы Незалежнасці па тэме будаўніцтва набегла нямала пытанняў. Літаральна кожнае з іх уважліва разглядалася на нарадзе. Якія ж рашэнні былі прыняты?

Узводзіць сумленна і якасна

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэта пасяджэнне ўжо можна назваць традыцыйным. Прэзідэнт падкрэсліў: падобныя мерапрыемствы будуць праводзіцца рэгулярна, гэта значыць прыкладна адзін раз на паўгода.

«Наша нарада нацэлена перш за ўсё на тое, каб атрымаць ад гэтага мерапрыемства вынік», — заявіў ён.

Прэзідэнт расказаў пра абуральную сітуацыю, аб якой яму нядаўна далажылі. У Мінску пабудавалі кватэры з коштам квадратнага метра ў 650 долараў, людзі стаялі ў чарзе, каб іх купіць. Але тут з'явілася некалькі грамадзян, якія купілі 64 кватэры і за наступны дзень амаль усе паспелі перапрадаць ужо па рынкавай, больш высокай цане.

А ўмовы былі такія: падведамнае гарвыканкаму прадпрыемства ўзяло на сябе абавязацельства з рэнтабельнасцю ў 5 % пабудаваць жыллё, аддаць яго гарвыканкаму па такой цане, а далей гарадскія ўлады вырашалі самі: прадаць па рынкавым кошце, аддаць малазабяспечаным, шматдзетным...

Кіраўнік дзяржавы даручыў неадкладна разабрацца ў сітуацыі.

Ён падкрэсліў: парадак трэба навесці ўсюды, у Беларусі ўмеюць і ведаюць, як працаваць. Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што патрабаванні Прэзідэнта па барацьбе з карупцыяй і іншымі правапарушэннямі будуць даведзены да кожнага на месцах.

Ён папярэдзіў, што суды атрымалі прамое ўказанне: пакуль не будзе змен у заканадаўстве, нікога з асуджаных за карупцыю датэрмінова не выпускаць. «За карупцыю будзем толькі дадаваць, — падкрэсліў беларускі лідар. — 25-ы раз паўтараю: лепш бедным на волі, чым багатым у турме».

За мінулую пяцігодку зніжаны якасныя паказчыкі па ўсёй галіне будаўніцтва. Паменшыўся яе ўклад у валавы ўнутраны прадукт, дапушчана падзенне аб'ёмаў падрадных работ, узвядзення жылля, абвастраюцца праблемы неплацяжоў, пагаршаецца фінансавы стан будаўнічых арганізацый, кожная чацвёртая будаўнічая арганізацыя стратная.

Разам з тым на найважнейшых аб'ектах краіны не хапае кваліфікаваных будаўнікоў.

«Як мне дакладваюць, сёлета ў галіне назіраецца рост асноўных паказчыкаў, — сказаў беларускі лідар. — Але на фоне ўстойлівага падзення цяперашняе паляпшэнне з'яўляецца не больш чым ажыўленнем, частковым аднаўленнем былых пазіцый, і мы не можам казаць аб станоўчай дынаміцы».

Аднак, дадаў кіраўнік дзяржавы, ёсць аб'ектыўныя прычыны негатыўных з'яў.

Фота БелТА.

Больш жылля для маючых патрэбу і арэнднага

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што будаўніцтва жылля заўсёды з'яўлялася найважнейшым прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі ў галіне. Аднак з 2014 года яго аб'ёмы пастаянна зніжаюцца — з амаль сямі мільёнаў квадратных метраў у 2010 годзе да крыху больш за чатыры ў 2017-м.

За два апошнія гады іх колькасць павялічылася на восем з паловай тысяч. Пры гэтым паўсюдна не выконваецца даручэнне аб накіраванні шматдзетных сем'яў на будаўніцтва жылля на працягу аднаго года.

«Стаўлю задачу ўраду сумесна з аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам павялічыць аб'ёмы будаўніцтва жылля для гэтай катэгорыі маючых патрэбу», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы даручыў разам з банкамі вызначыць неабходныя крыніцы фінансавання, за два наступныя гады ліквідаваць чаргу, якая ўтварылася, і выйсці на забеспячэнне шматдзетных сем'яў жыллём на працягу аднаго года, як гэта прадугледжана Указам № 13.

Акрамя таго, занепакоенасць у Прэзідэнта выклікае наяўнасць звышнарматыўных жылых дамоў (35), пра што ён сказаў чарговы раз. Такіх быць не павінна. Ён заявіў, што даручыць КДК і пракуратуры разабрацца з імі і «спытаць на ўсю катушку».

СТАР. 2

КАРАТКА

- Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў кастрычніку склала BYN999,7.
- **У краіне плануецца замацаваць права суда накіроўваць мужа і жонку перад разводам на сустрэчу з медыятарам.**
- Беларуска Вікторыя Кебікава ўпершыню ў гісторыі айчыннай школы бокса заваявала бронзавую ўзнагароду чэмпіянату свету.

- **З 26 лістапада да 6 снежня ДАІ правядзе рэспубліканскую акцыю для папярэджання і прафілактыкі ДТЗ у зімовы перыяд.**
- Урач з Пінска за неаказанне дапамогі пацыенту, які ў той жа дзень памёр, атрымаў паўтара года абмежавання волі і штраф.

ISSN 1990 - 763X

Віват, найлепшыя!

Паэт, педыятр, «Платон»

У Мінску выбралі «Студэнта года — 2018»

Тытул застаўся ў Гродзеншчыны: яе ўраджэнка, мінулагодняя пераможца Аляксандра Радковіч, узрадавалася і з гонарам абвясціла, што сёлета яго ўладальнікам стаў пяцікурснік Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Антон ЛЕМЕШ *(на фота)***. Журы прызнала юнака найлепшым у фінале VIII рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі «Студэнт года — 2018».**

Акрамя Антона яшчэ два хлопцы і шэсць дзяўчат песнямі, танцамі, вершамі дэманстравалі сваё ўсебаковае развіццё. А сам ён стараўся быць на сцэне максімальна шчырым. «Сёння я даказаў, што, нават калі не ўмееш спяваць і танцаваць, перамога ўсё адно можа быць за табой», — сказаў хлопец.

Стаць найлепшым у конкурсе — няпроста. Аднак, як з іроніяй заўважае Антон, «складаней, чым вучоба ў медыцынскім, нічога не бывае». За пяць гадоў будучы ўрач паспеў і дзяцей палячыць, і ў хуткай дапамозе папрацаваць, і нават роды прыняць.

СТАР. 13

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

БУДАВАЦЬ — НЕ ГАРАВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Усім губернатарам, старшыні Мінскага гарвыканкама — трэба такі дом узяць пад асабісты кантроль і завяршыць будаўніцтва. Апошні тэрмін — першая палова 2019 года», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён канстатаваў, што павольнымі тэмпамі развіваецца рынак арэнднага жылля. За шэсць гадоў яго ўзведзена толькі 745 тысяч метраў, што складае каля 2,5 % ад агульнага аб'ёму.

«Даручаю ўраду, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму перагледзець праграмы жыллёвага будаўніцтва, максімальна павялічыўшы долю арэнднага жылля з прыцягненнем фінансаў прадпрыемстваў і арганізацый», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу прысутных, што задачай урада застаецца захаванне формулы «адзін квадратны метр з дзяржпадтрымкай — не даражэй за сярэднямесячную заработную плату».

«Пры гэтым папярэджваю ўсіх: дасягненне ўзроўню заработнай платы ў 1000 рублёў не азначае, што метр жылля аўтаматычна павінен каштаваць столькі ж», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Гарады-спадарожнікі, домабудаўнічыя камбінаты і вытворчасць будматэрыялаў

Сёння большасць насельніцтва краіны па-ранейшаму сканцэнтравана ў буйных гарадах.

Беларускі лідар нагадаў, што першыя крокі ў вырашэнні гэтай сітуацыі былі зроблены яшчэ ў 2014 годзе пасля выдання Указа «Аб развіцці гарадоў-спадарожнікаў». «Аднак яго рэалізацыя аказалася неэфектыўнай, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Патрабую ад урада неадкладна прыступіць да выканання прынятых рашэнняў па развіцці гарадоў-спадарожнікаў з павелічэннем аб'ёмаў будаўніцтва жылля».

«Трэба ствараць раёны малапавярховай забудовы», — падкрэсліў ён.

Міністру архітэктуры ён даручыў наступнае: рэалізаваць у адным з гарадоў пілотны праект па комплекснай забудове зямельнага ўчастка малапавярховымі жылымі дамамі.

Кіраўнік дзяржавы закрануў у сваім выступленні і прыдамавыя пляцоўкі, якія ўладкоўваюцца мінімальна. Беларускі лідар адзначыў, што дае год на рашэнне гэтай праблемы, і даручыў Мінбудархітэктуры ўстанавіць абавязковыя правілы па стварэнні камфортнага асяроддзя ў мікрараёнах-новабудоўлях.

Таксама Прэзідэнт раскрытыкаваў беларускія домабудаўнічыя камбінаты.

Ён падкрэсліў: трэба разабрацца, у чым прычына іх неэфектыўнасці. «Аднак на самай справе хто хоча знайсці работу, той яе знаходзіць. Нягледзячы на цяжкасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таксама кіраўнік дзяржавы даручыў вызначыць з ліку домабудаўнічых камбінатаў асноўных забудоўшчыкаў кварталаў па краіне і давесці ім напружанае заданне па экспарце іх прадукцыі і паслуг.

Асобна ў сваім выступленні ён спыніўся на рабоце цэментных і шкляных заводаў, якія былі мадэрнізаваны для павышэння іх канкурэнтаздольнасці. Паводле яго слоў, запрацаваць на поўную магутнасць і забяспечыць прыбытковую дзейнасць у іх пакуль не атрымалася — і гэта мякка сказана.

«Патрабую ад урада прыняць усе меры па загрузцы вытворчых магутнасцяў і стабільнай работы абсталявання», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што не лепшая сітуацыя склалася і на шкляных заводах. З пяці шклатарных заводаў у краіне засталося тры, ды і тыя не загружаныя. Ён даручыў Мінбудархітэктуры сумесна з Белдзяржхарчпрамам і Мінсельгасхарчам неадкладна прыняць меры па мінімізацыі закупак шкляной тары за мяжой і загрузцы нашых заводаў.

Прадаваць трэба выгадна

У сваім выступленні Прэзідэнт Беларусі звярнуў асаблівую ўвагу на неабходнасць развіцця экспарту. «Вырабіць прадукцыю — не асноўная задача, — сказаў ён. — Галоўнае — выгадна прадаць і зарабіць, а пажадана — прадаць за межы краіны».

Аляксандр Лукашэнка раскрыў акалічнасці некаторых лічбаў: згодна з інфармацыяй Саўміна, больш за 40 % ад усяго аб'ёму будаўнічых матэрыялаў пастаўляецца на экспарт. Аднак значная доля цэменту прадаецца ў Расію манапалісту «Еўрацэмент груп», які дыктуе беларускім вытворцам не заўсёды выгадныя ўмовы. Уласная тавараправодная сетка так не была створана, на біржы цэмент не прадаецца з-за больш высокіх цэн, чым па прамых дагаворах. «Усё гэта і стварае перадумовы для карупцыі і з'яўлення шэрых схем», — папярэдзіў Прэзідэнт і запатрабаваў ад урада забяспечыць эфектыўнасць і празрыстасць гандлю на знешніх рынках.

Яшчэ адна праблема — своечасовыя разлікі. Прэзідэнт нагадаў Міхаілу Мясніковічу пра персанальную адказнасць за будаўніцтва беларусамі Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната, за якое дагэтуль не атрыманы грошы. Не разлічыліся і расіяне за аб'екты, пабудаваныя ў Калузе да чэмпіянату свету па футболе.

Кіраўнік дзяржавы даручыў ураду неадкладна падключыцца да рашэння гэтых пытанняў.

Наконт зацікаўленасці замежнымі інвестарамі ў беларускіх прадпрыемствах па вытворчасці будматэрыялаў Аляксандр Лукашэнка паўтарыў нязменны тэзіс: галоўнае — людзі. Калі да яго прыходзіць патэнцыйны пакупнік беларускай кампаніі, які пасля афармлення здзелкі збіраецца звальняць супрацоўнікаў, то размова на гэтым заканчваецца. «Калі мы прымем рашэнне, што нам трэба нешта прадаць, у тым ліку і замежнаму інвестару, то першы крытэрый — гэта цана. І далей — што будзе пасля?» — нагадаў ён.

На ўзровень кіраўніка дзяржавы трэба ўносіць толькі комплексныя прапановы, калі ёсць упэўненасць, што яны дастаткова эфектыўныя і выгадныя краіне, акцэнтаваў Прэзідэнт. Саўміну даручана разабрацца з гэтым пытаннем да 31 снежня гэтага года.

Праектаваць — сучасна

На жаль, не адбылося кардынальных змен у сферы якасці і тэрмінаў праектавання.

Зараз у Беларусі будуецца каля васьмі тысяч аб'ектаў. З іх з перавышэннем нарматыўнага тэрміну — палова. І ў большасці выпадкаў прычынай з'яўляюцца бясконцыя карэкціроўкі праектаў. У гэтай сувязі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў прыняць неабходныя меры па павышэнні адказнасці распрацоўшчыкаў за якасць праектнай дакументацыі і тэрміны яе падрыхтоўкі.

Асобна Прэзідэнт спыніўся на злоўжыванні тыпавымі праектамі. «Тыпавымі могуць быць прамысловыя будынкі, збудаванні, трансфарматарныя падстанцыі, кацельні. Але дзіцячыя садкі, школы і іншыя сацыяльныя аб'екты павінны быць арыгінальнымі, — сказаў ён. — Тыпавымі ў іх могуць быць толькі тэхналогія, асобныя канструкцыйныя элементы, вузлы і дэталі, з якіх яны будуць збірацца».

Губернатарам і старшыням райвыканкамаў кіраўнік дзяржавы нагадаў пра тое, што населеныя пункты павінны літаральна тануць у кветках і зеляніне.

Нормы ў «адны рукі»

Каб сысці ад зарэгуляванасці ў будаўнічай сферы, што не ўдалося зрабіць за апошнія пяць гадоў, неабходна сканцэнтраваць усё галіновае заканадаўства ў «адных руках» і вызначыць Мінбудархітэктуры адзіным органам, які фарміруе дзяржаўную палітыку ў будаўнічай сферы.

Толькі профільнае міністэрства павінна ўстанаўліваць будаўнічыя нормы. Задача астатніх — вызначаць нормы эксплуатацыі і забяспечваць кантроль за іх захаваннем, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу губернатараў на неабходнасць захавання ўстаноўленых тэрмінаў адміністрацыйных працэдур, выключэння бюракратызму пры афармленні роду дакументацыі. Ураду разам з выканкамамі, Мінскім гарвыканкамам Прэзідэнт даручыў завяршыць работу па прывядзенні прававых актаў у адпаведнасць з Дэкрэтам № 7 да канца года. Акрамя таго, неабходна спрашчэнне адміністрацыйных працэдур з выкананнем анлайн-сэрвісаў.

Кадры — захаваць

Сур'ёзную заклапочанасць Прэзідэнт выказаў наконт адтоку спецыялістаў-будаўнікоў. «За пяць гадоў галіна згубіла больш за 50 тысяч рабочых. Яны з'язджаюць на заробкі ў Расію, Польшчу і Літву, дзе іх прымаюць. Дык чаму не бачна нашых падрадчыкаў? — спытаў Прэзідэнт. — Саўмін так і не прыняў меры для таго, каб нашы спецыялісты працавалі ў беларускіх арганізацыях на тэрыторыі іншых дзяржаў».

Кіраўнік дзяржавы таксама абурыўся сітуацыяй, пры якой аплата працы будаўнікоў у Мінску і рэгіёнах аказалася розная. Ён загадаў неадкладна спыніць такую дыскрымінацыю. «У нас усе грамадзяне роўныя, незалежна ад таго, дзе жывуць і працуюць. За роўную якасную працу павінна быць роўная ўзнагарода», — падкрэсліў беларускі лідар.

Не менш важная задача — падрыхтоўка годнай змены ў галіне. Ураду даручана да 2020 года вырашыць пытанне аб прыцягненні арганізацый — заказчыкаў кадраў да ўдзелу ў сафінансаванні падрыхтоўкі спецыялістаў, замацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, у тым ліку цэнтраў вытворчага навучання. Мінадукацыі сумесна з Мінбудархітэктуры неабходна павялічыць долю практычнага навучання і стажыровак на вытворчасці, падняўшы іх узровень і якасць.

«Час не стаіць на месцы, і патрабаванні да галіны з кожным годам будуць толькі расці, — рэзюмаваў Прэзідэнт. — Неабходна рухацца наперад. Адпаведная база ўжо падрыхтаваная, трэба толькі правільна і з усёй адказнасцю выкарыстоўваць магчымасці, якія маюцца».

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кошт нафты працягвае абвальвацца

Нафта WTI ўчора патаннела на 5,9 працэнта, а Brent — на 5,3 працэнты. Упершыню з кастрычніка мінулага года кошт «чорнага золата» склаў менш чым 60 долараў за бараль, сведчаць даныя таргоў. Асноўным негатыўным фактарам для рынку нафты застаюцца асцярогі перанасычэння рынку сыравінай на фоне перспектыў запаволення росту сусветнай эканомікі. Гэтыя асцярогі ўзмацніліся пасля чарговых звестак аб росце запасаў у ЗША. Мінэнерга ЗША днямі паведаміла, што за тыдзень камерцыйныя запасы нафты ў краіне выраслі на 4,9 мільёна бараляў, хоць аналітыкі чакалі росту толькі на 2,5 мільёна бараляў. «Нечакана рэзкі рост запасаў у ЗША спрыяў захаванню трывожнасці на рынках. У агляднай будучыні мы не чакаем заканчэння зыходнага трэнду. Для гэтага спатрэбіцца дакладная заява ад АПЕК пра гатоўнасць значна скараціць нафтаздабычу», — прыводзіць агенцтва Market Watch каментарый аналітыкаў Commerzbank. Як вядома, АПЕК і шэраг краін, якія не ўваходзяць у арганізацыю (АПЕК+), дамовіліся ў канцы 2016-га ў Вене аб скарачэнні здабычы нафты на 1,8 мільёна бараляў у суткі. Дагавор стартаваў з пачатку мінулага года і быў падоўжаны да канца 2018-га. Аднак апошнім часам удзельнікі здзелкі ўсё часцей гавораць аб рызыцы празмернасці аб'ёму сыравіны на рынку налета. Свае далейшыя дзеянні ўдзельнікі здзелкі будуць абмяркоўваць у пачатку снежня. Дарэчы, цэны на нафту пачалі рэзкае падзенне ў першай палове кастрычніка. За гэты час кошт нафты маркі Brent паменшыўся прыкладна на 28 працэнтаў.

У кожнага шостага жыхара ЕС разлад псіхікі

Праблемы псіхічнага здароўя назіраюцца ў кожнага шостага жыхара Еўрапейскага саюза. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваным сумесным дакладзе Еўракамісіі і Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця. Згодна з прыведзенымі звесткамі, вастрэй за ўсё праблема стаіць у Фінляндыі, Нідэрландах, Францыі, Ірландыі і Партугаліі. Гаворка ідзе, у прыватнасці, пра такія хваробы, як дэпрэсія, неўрозы і расстройствы, выкліканыя злоўжываннем алкаголем і наркотыкамі. Як сцвярджаецца ў дакладзе, з-за такой сітуацыі штогадовая шкода для эканомікі складае каля 600 мільярдаў еўра, што адпавядае 4 працэнтам ВУП Еўрасаюза. У асноўным гэта звязана з праблемамі працаўладкавання, якія нярэдка ўзнікаюць у людзей з падобнымі захворваннямі, што адбіваецца на ўзроўні беспрацоўя. Акрамя таго, страты складаюцца са значных выдаткаў, што выдзяляюцца на розныя праграмы сацыяльнага страхавання, а таксама ідуць непасрэдна на медыцынскую дапамогу пацыентам.

Пізанская вежа перастала падаць

Вугал нахілу падаючай Пізанскай вежы, адной з самых папулярных архітэктурных славутасцяў Італіі, стаў меншы. Па словах экспертаў, якія сачылі за рэстаўрацыйнымі работамі, за апошнія 20 гадоў 57-метровая вежа заўважна выпрасталася. «Як быццам памаладзела», — адзначыў у размове з Бі-бі-сі прафесар Сальватору Сэціс. У 1990 годзе вежу ўпершыню за 800 гадоў закрылі для турыстаў з-за боязі, што яна можа ўпасці. У той час нахіл складаў 4,5 метра ад вертыкальнага становішча. Міжнародная камісія на чале з польскім экспертам прафесарам Міхалам Ямёлькоўскім працавала над стабілізацыяй вежы з 1993 да 2001 года. У выніку вугал нахілу паправілі на 45 сантыметраў, выдаткаваўшы на гэта больш за 250 мільёнаў долараў. Як вядома, Пізанская вежа пачала нахіляцца ўжо праз пяць гадоў пасля пачатку будаўніцтва ў 1173 годзе. Пласт пяску і гліны, на якім пабудавана вежа, мякчэй з яе паўднёвага боку, чым з паўночнага. Будаўнікі яшчэ не паспелі дабудаваць трэці паверх, а размякчэнне глебы пад вежай ужо прывяло да нахілу.

Выхаванне актыўнага грамадзяніна

Для старшакласнікаў ладзяць сустрэчы са знакавымі персонамі

— Мы арганізуем адзіныя інфармацыйныя гадзіны для навучэнцаў старшых класаў з мэтай іх патрыятычнага выхавання, фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі. І запрашаем на сустрэчы цікавых палітычных і грамадскіх асоб, тых, каму моладзь жадала б задаць свае пытанні. Бо заўсёды цікава пачуць меркаванне збоку, — удакладняе Вольга Лысянкова, намеснік дырэктара магілёўскай гімназіі № 2. Менавіта сюды мы завіталі, каб паназіраць за тым, як у краіне рэалізуецца праект «Школа актыўнага грамадзяніна».

Нагадаем, што падобныя сустрэчы ладзяцца па ініцыятыве Міністэрства адукацыі. Напрыклад, 22 лістапада размова вялася на тэму «Беларусь. Сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя падзеі лістапада». Са старшакласнікамі другой гімназіі ў Магілёве сустрэўся **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і навуцы Ігар МАРЗАЛЮК.**

— З маладымі нельга хлусіць, трэба быць шчырымі і не баяцца іх пытанняў. Мы ў гэтым узросце таксама былі максімалістамі. Проста маладым уласцівы творчы пошук, а сталасці — разуменне, што свет не пераробіш. Моладзь — гэта заўсёды рухавік грамадства, вечны яго драйвер. І вельмі хацелася б, каб усё тое, што мы робім у парламенце, у краіне, садзейнічала б таму, каб моладзь шукала сябе тут, каб яна будавала сваю краіну, каб несла за гэта адказнасць. Я перакананы, што ў нас класныя дзеці, гэта падмацоўваюць і сацыялагічныя даследаванні. Абсалютная большасць маладых людзей марыць стварыць сям'ю. А сям'я і радзіма — гэта знакавыя рэчы, якія аб'ядноўваюць усе пакаленні.

На думку парламентарыя, акрамя такога кшталту сустрэч трэба, каб і бацькі, і дарослыя, і тыя, хто выхоўвае дзяцей, абавязкова прысутнічалі ў тых сферах, дзе бавіць час моладзь — у інтэрнэце, напрыклад. «Бывае нейкі ролік, закінуты ў сусветнае сеціва, дае больш моцны эфект, чым маса сумных лекцый», — заўважае дэпутат.

Кіраўніцтва гімназіі салідарнае ў тым, што сустрэчы з цікавымі людзьмі дапамагаюць навучэнцам выхоўваць у сабе крытычнае мысленне, камунікатыўныя навыкі, развіваць лідарскія якасці. Дарэчы, найбольш актыўныя гімназісты таксама з'яўляюцца лектарамі, вядуць размову з аднагодкамі на прынцыпах «роўны навучае роўнага». У гімназіі адзначаюць, што нават выбары ў маладзёжны парламент вяліся вельмі актыўна. Падлеткі пісалі праграмы, змагаліся за перамогу, бралі на сябе нейкія абавязацельствы.

— Маладому чалавеку ў першую чаргу трэба быць актыўным для сябе, бо, калі нешта хочаш змяніць у краіне, трэба перш за ўсё пачынаць з сябе. І ўдзел нават у маленькіх акцыях дапамагае рабіць нешта вялікае, агульнае і імкнуцца да лепшага, — упэўнена навучэнка гімназіі **Карына БУРАЧЭЎСКАЯ, фіналістка інтэлектуальнага тэлешоу «Я ведаю».**

— Нават з улікам асаблівасцяў падлеткавага ўзросту, уласнага яму нігілізму, нашы гімназісты дэманструюць шчырую любоў да сваёй гімназіі, сваёй малой радзімы, — кажа Вольга Лысянкова.

— Ёсць ісціны, якія не старэюць. У старажытных рымлянаў быў лозунг «Жыццё кароткае, бацькаўшчына — вечная». А вялікі французскі гісторык казаў: «Дзяржавы знікаюць не ад эканамічных крызісаў, а ад адсутнасці веры, што гэта дзяржава мусіць быць». Веры ў тое, што ў Еўрапейскім саюзе называецца сістэмай каштоўнасцяў, а ў нас ідэалогіяй. Гэта фундаментальныя рэчы — павага да сям'і, павага да сцяга, дзяржавы, культуры. Гэтыя паняцці пры ўсёй разнастайнасці грамадства, незалежна ад яго ўзросту і палітычных прыхільнасцяў, з'яўляюцца падмуркам. Маладыя людзі — найважнейшы элемент грамадства. І не толькі таму, што яны працяг нас. Яны добрыя настолькі, наколькі добра мы іх выхавалі і ў тым ліку, наколькі якасная палітыка ў дачыненні да моладзі праводзіцца на заканадаўчым узроўні, — рэзюмаваў Ігар Марзалюк.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Армія

ПАДАРУНАК АД МІНІСТРА АБАРОНЫ

У Цэнтральным доме афіцэраў урачыста ўганаравалі найлепшых ваеннаслужачых тэрміновай службы. Яны прадстаўлялі розныя віды войскаў. Юнакі за год дамагліся выдатных вынікаў у баявой падрыхтоўцы. 60 салдат і сяржантаў атрымалі гадзіннікі з рук міністра абароны Андрэя РАЎКОВА.

Радавы Алег Філіповіч — адзін з 60 найлепшых салдат. Ён — кіроўца — экспедытар апаратнай. Служыць у Барысаве. Сам хлопец да таго жыў у Пухавічах. Адлегласць не такая і далёкая, але...

— Сказаць па праўдзе, калі прыязджаюць кожны тыдзень, гэта для мяне не вельмі добра. Таму я папрасіў бацькоў, каб яны наведвалі мяне радзей. Я працую на аўтамабілі «Урал». Канешне, пасля легкавога аўтамабіля было крыху складана перасаджвацца на такі габарытны аўтамабіль, але цярпенне і няспынная праца зрабілі сваю добрую справу.

Прыемнай адметнасцю стала тое, што на свята былі запрошаны маці вайскоўцаў. У іх адрас прагучалі самыя цёплыя словы падзякі. Таксама ім былі ўручаны падзячныя лісты. Урачыстая цырымонія стала фінальным акордам адыходзячага навучальнага года ў беларускім войску. І наступны навучальны год будзе таксама няпросты і вельмі адказны.

Міністр абароны Андрэй Раўкоў падзякаваў салдатам і сяржантам за іх нялёгкую працу.

— Вы з тысяч вайскоўцаў сталі найлепшымі. Менавіта вас выбралі камандзіры. Можна пачуць, што цяперашняе пакаленне не такое, як ранейшае. Але ў нас выдатная моладзь, з якой вырастаюць сапраўдныя патрыёты сваёй Радзімы. Мір і спакой на беларускай зямлі забяспечваюць салдаты, якія нясуць сваё баявое дзяжурства ўдзень і ўначы і здольныя выконваць любыя задачы нават у вельмі складаных умовах. Хачу сказаць мамам «дзякуй» за тое, што ў такіх выніках ёсць і вялікая частка вашай працы. Менавіта вы фарміравалі характары і перакананні сваіх сыноў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Я зноў выбіраю «Звязду»

Газета папулярызуе мову

Начальнік упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Пётр ПАДГУРСКІ:

«З усіх рэспубліканскіх дзяржаўных СМІ «Звязда» — найстарэйшая. Яна — адзіная, якая друкуецца на беларускай мове. І зразумела, такім чынам газета папулярызуе родную мову.

З інтарэсам чытаю ў «Звяздзе» аналітычныя матэрыялы, якіх на старонках нямала, з асаблівай увагай — артыкулы па пытаннях культуры».

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Шырокія шляхі супрацоўніцтва: Беларусь — Узбекістан

У Міністэрстве інфармацыі краіны прайшла сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Насірджанам Юсупавым.

Узбекскі пасол закрануў цэлы шэраг пытанняў медыйнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. Найперш — у фармаце абмену інфармацыйнымі матэрыяламі. Звярнуў увагу на тое, што развіццю турызму нашых краін, пашырэнню аказання беларускім бокам адукацыйных паслуг грамадзянам Узбекістана магло б спрыяць якраз болей важкае інфармаванне пра падзеі ў Беларусі на старонках газет і часопісаў, у тэлевізійным эфіры ўзбекскіх СМІ. Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч пацвердзіў жаданне беларускага боку сфарміраваць прэс-тур журналістаў вядучых СМІ нашай краіны ва Узбекістан. Папярэдне вызначаны і час такой паездкі — першы квартал 2019 года. Размова ішла і пра інфармацыйнае суправаджэнне II Еўрапейскіх гульняў у сродках масавай інфармацыі Узбекістана.

Напярадзе — правядзенне Мінскага міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час» у лютым 2019 года. Узбекскі пасол паабяцаў, што да ўдзелу ў ім далучыцца і кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў Узбекістана.

Сяргей ШЫЧКО.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества пансионата «Салтыковка», принадлежащего ОАО «Нафтан» на праве собственности

Лот № 1, состав: 1. Здание 1-этажное, литера А, площадь 210,7 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83897. 2. Здание нежилое, 3-этажное, литера Б, площадь 2156,7 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83903. 3. Здание (котельная), нежилое, литера Е, площадь 36,6 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0030107:48. 4. Здание, литера В-В1, площадь 62,1 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83894. 5. Скважина (артезианская) № 1, литера К. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0000000:83912. 6. Земельный участок для размещения пансионата, площадь 9 048,0 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0030107:2. 7. Земельный участок для размещения дома президента, площадь 718,0 кв. м. Кадастровый № в ЕГРН 50:15:0030107:3. 8. Забор с воротами, литера 1-6. 9. Навес, литера Г, Г5. 10. Замощение, литера I-II. 11. Навес, литера Г2. 12. Беседка, литера ГЗ. 13. Бассейн, литера Г4. 14. Иное имущество, входящее в состав Лота № 1: движимое имущество (оборудование, мебель, хозяйственный инвентарь и т. д.), в том числе: основные средства в количестве 99 единиц, малоценные предметы в количестве 1200 единиц.

Местонахождение Лота № 1: Российская Федерация, Московская область, город Балашиха, микрорайон Салтыковка, ул. Профсоюзная, 12.

Начальная цена (без учета НДС) – 203 273 026,26 рос. руб.

Задаток – 10 000 000 рос. руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

Обременение. Договор безвозмездного пользования имуществом от 24.09.2007 № 061.09.4595, заключенный между Посольством Республики Беларусь в Российской Федерации и ОАО «Нафтан». Договором не предусмотрено наложение ограничений/обременений на реализацию права ОАО «Нафтан», связанного с продажей имущества, принадлежащего ему на праве собственности. При продаже Лота № 1 договор безвозмездного пользования имуществом от 24.09.2007 № 061.09.4595 подлежит расторжению по соглашению сторон до государственной регистрации договора купли-продажи Лота № 1

УСЛОВИЯ

1. К участию в аукционных торгах допускаются физические, юридические лица и индивидуальные предприниматели, без ограничения, вне зависимости от государственной принадлежности, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе, внесшие задаток и представившие другие необходимые документы.
В качестве участника аукциона регистрируются лица, задаток которых поступил на расчетный счет Организатора аукциона на момент подачи заявления на участие в аукционе с необходимыми документами.
2. Задаток за участие в аукционных торгах устанавливается в российских рублях (для нерезидентов Республики Беларусь), для резидентов Республики Беларусь – в белорусских рублях. При внесении задатка в белорусских рублях – сумма платежа определяется по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату внесения задатка.
3. Задаток, внесенный участником аукциона, признанным Победителем аукциона (Претендентом на покупку), засчитывается ему в счет окончательной стоимости Лота № 1 и учитывается при расчетах по договору купли-продажи.
Участникам аукциона, не ставшими Победителями аукциона (Претендентами на покупку), Организатор аукциона возвращает сумму внесенного ими задатка в течение 5 банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену за Лот № 1.
5. При наличии заявления на участие в аукционных торгах только от одного участника и его согласия приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), данный участник получает статус «Претендент на покупку» и на него распространяются правила и условия участия в аукционных торгах, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.
6. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 1 % от цены продажи Лота № 1 без учета НДС в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
Для резидента Республики Беларусь валюта платежа – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона.
7. Валюта платежа при заключении договора купли-продажи:
7.1. С нерезидентом Республики Беларусь – российский рубль.
Перечисление денежных средств за приобретенный на аукционе Лот № 1 осуществляется за пределами Республики Беларусь путем безналичного банковского перевода денежных средств на валютный счет ОАО «Нафтан».
7.2. С резидентом Республики Беларусь – белорусский рубль.
Для исполнения Победителем аукциона (Претендентом на покупку) денежных обязательств по договору купли-продажи пересчет осуществляется по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату перечисления денежных средств в счет оплаты стоимости приобретенного на аукционе Лота № 1.
Форма перечисления денежных средств за приобретенный на аукционе Лот № 1 – безналичный банковский перевод денежных средств на расчетный счет ОАО «Нафтан».
8. Комиссионные расходы по внесению наличных денежных средств в кассу банка и /или безналичного перевода денежных средств производятся за счет Победителя аукциона (Претендента на покупку) согласно тарифам банка.
9. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан подписать договор купли-продажи Лота № 1 с Продавцом в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
10. Расчет за приобретенный на аукционных торгах Лоту № 1 производится путем перечисления денежных средств Победителем (Претендентом на покупку) в порядке предоплаты на валютный (расчетный) счет Продавца в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.
11. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать передаточный акт, подать заявление и документы совместно с Продавцом на государственную регистрацию перехода права собственности на недвижимое имущество в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня поступления на (валютный) расчетный счет Продавца полной стоимости приобретенного на аукционных торгах Лота № 1 с отнесением всех расходов по государственной регистрации (уплате государственной пошлины) на Победителя аукциона (Претендента на покупку).
12. Право собственности сохраняется за Продавцом до проведения государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество от Доверителя к Победителю аукциона (Претенденту на покупку).
13. Цель использования Победителем аукциона (Претендентом на покупку) Лота № 1 не ограничивается.
14. Форма договора купли-продажи, размещенная на официальном сайте Продавца, является примерной, в которую допускается внесение изменений и дополнений в процессе его подписания сторонами и осуществления государственной регистрации.
15. Согласно законодательству Российской Федерации операции по реализации земельных участков не признаются объектом налогообложения по налогу на добавленную стоимость.
Реализация остального имущества будет дополнительно облагаться налогом на добавленную стоимость по ставке, действующей в Российской Федерации на дату подписания договора купли-продажи

Аукцион состоится 26.12.2018 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток для **резидентов** Республики Беларусь перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Задаток для **нерезидентов** Республики Беларусь перечисляется на текущий счет в российских рублях BY57BLBB30120190055182001006, BIC банка BLBBBY2X, в ОАО «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. ОКПО 37492021. ПАО «Сбербанк России» г. Москва, ИНН 7707083893, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, счет 30111810800000000154. SWIFT код SABRRUMM.
Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Нафтан», проводимом 26.12.2018.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, оформление и регистрация сделки в соответствии с законодательством Российской Федерации.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений – 21.12.2018 в 11.00.
Контактные лица для осмотра Объекта аукциона: Гопко Владимир Иванович, тел. + 7 (916) 702-00-38, Жук Юрий Алексеевич, тел. + 7 (916) 471-31-39

Организатор аукциона: +7 (495) 108-50-61, +375 (17) 324-70-57, +375 (29) 550-09-52, +375 (29) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 11 (86)

Аты-баты

«Бярыце з сабой тэрмас з гарбатай. І не хвалюйцеся»

Карэспандэнты «Звязды» высвятлялі, як праходзіць прызыў

Марозным лістападаўскім днём каля ваеннага камісарыята горада Мінска даволі шматлюдна. Бацькі, браты, сёстры, дзядулі, бабулі, дзяўчаты праводзяць у армію маладых хлопцаў. У гэты дзень каля сотні іх адпраўляецца служыць у падраздзяленні сіл спецыяльных аперацый, сухапутныя, унутраныя войскі, Мінскую ваенную камендатуру і войскі дзяржаўнай бяспекі. Развітанне адбываецца пад гукі гармоніка, які прынёс нехта з бацькоў...

Да таго часу, як па юнакоў на зборны пункт прыйдуць аўтобусы, застаецца крыху больш за гадзіну. Цікава, як яны пачуваюць сябе перад тым, як на год ці паўтара адправіцца ў воінскую часць?

Канстанцін Махоцін родам з Віцебскай вобласці. Але апошнім часам хлопец перабраўся ў Мінск.

— За плячыма ў мяне пакуль — толькі сярэдняя школа. Таму служыць буду васямнаццаць месяцаў. Вучыцца ва ўніверсітэт не паступаў, бо ездзіў на заробкі ў Расію. Ну а пасля прыйшла павестка ў ваенкамат... Медкамісію там я прайшоў за лічаныя дні. Прызналі годным да воінскай службы. Калісьці хацеў служыць у сталіцы, у знакамітай часці 3214. Але ў выніку мяне вырашылі адправіць у спецназ — у Мар'іну Горку. Што ж, таксама нядрэнна. Бацькі станоўча паставіліся да таго, што мне давядзецца паўтара гады правесці ў такім родзе войскаў. Кажуць — пасталееш за гэты час, станеш больш мужны...

Канстанцін у школе тры гады займаўся боксам. Пэўна, гэта і паўплывала на выбар месца яго будучай службы разам з вынікамі псіхалагічнага тэсціравання.

— Апошні вечар перад войскам я правёў дома. Пасядзелі з бацькамі і самымі блізкімі сябрамі. А тым, хто прыйдзе на зборныя пункты, хачу параіць адно: бярыце з сабой тэрмас з гарачай гарбатай і не хвалюйцеся. І не саромцеся задаваць пытанні. Напрыклад, я ўжо паспеў пагутарыць з хлопцамі, якія служаць у Мар'інай Горцы і пойдуць на дэмбель праз тыдзень-другі. Так бы мовіць, разведаў абстаноўку.

Маці Наталля Крук праводзіць дваіх дзяцей. Яны — пагодкі, скончылі вучобу разам. Вось толькі служыць будуць у розных часцях. Адзін будзе праходзіць «курс маладога байца» ў Віцебску, а далей служба працягнецца ў Калодзішчах. Другі ж пойдзе ў пагранічныя войскі.

— Першыя павесткі прыйшлі сынам яшчэ ў чэрвені. Іх адправілі ад ваенкамата вучыцца ў аўташколу. Праўда, хацелася б у ідэале, каб яны служылі разам: усё-такі трэба будзе выбіраць, да каго менавіта прыязджаць на прысягу. Але як ёсць, так ёсць. На апошні вечар у хатніх сценах прыехалі ўсе родныя — трыццаць чалавек.

А вось 22-гадовы Яўген Бажанаў стаіць адзін. З бацькамі ён развітаўся яшчэ раніцай. Хлопец крыху хвалюецца.

— Я скончыў каледж прадпрымальніцтва і па гэтай жа спецыяльнасці інстытут. Ужо вядома, што буду служыць у Мінскай камендатуры. Нават расказалі, што будзе ўваходзіць у мае абавязкі. Гэта будзе адно з двух: або патруляванне горада, або служба ў роце ганаровай варты. Сам я родам з Мінска, таму бацькам нікуды ездзіць не давядзецца. Паколькі я атрымаў вышэйшую адукацыю, то служыць мне ўсяго год.

Павестка Яўгену не прыходзіла. Гэта таму, што хлопец пасля таго, як атрымаў дыплом, сам пайшоў у ваенкамат з усімі дакументамі.

— У мяне служылі абодва дзяды. Пакуль яны былі жывыя, то дзяліліся сваімі ўспамінамі пра армію. Расказвалі пра цяжкасці, з якімі сутыкаліся падчас службы. Можна нават сказаць, што я завочна прайшоў «курс маладога байца». Разам з тым я сябрую і са спортам. Раней шмат займаўся футболам, цяпер інтарэсы пераключыліся ў бок камп'ютараў.

Дзве кароткія гісторыі... А ўсяго сёлетняй восенню плануецца прызваць у войска да 13 тысяч хлопцаў.

— Выкліку на прызыўныя камісіі ўвосень гэтага года падлягаюць каля 70 тысяч чалавек, — паведаміў **начальнік аддзела галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Алег ПАЗНЯК.** Па стане на 15 лістапада раённыя і гарадскія прызыўныя камісіі прынялі больш за 50 тысяч рашэнняў. Было дадзена больш за 25 тысяч адтэрміновак. 85 працэнтаў з іх звязаны з працягам адукацыі. Астатнія размеркаваліся паміж тымі, хто часова нягодны па стане здароўя, сямейным становішчы і атрымлівае вайскова-тэхнічныя спецыяльнасці.

Хлопец, які прадставіўся Аляксандрам, атрымаў адтэрміноўку яшчэ ў 18 гадоў. Зараз яму споўнілася 22. Чатыры гады Аляксандра не прызывалі ў войска, таму што ён быў адзіным карміцелем у шматдзетнай сям'і, у якой было ажно шасцёра малых. А цяпер адтэрміноўка скончылася.

— За плячыма ў мяне прафесійна-тэхнічнае вучылішча. Працаваў зваршчыкам. Пэўна, на тое, што мяне адправяць у 5-ю брыгаду, паўплывала тое, што я займаўся ў юнацтве біятлонам. Цікава, што я тут знайшоў сваіх знаёмых з Ленінскага раёна. Як кажуць, свет цесны. І служыць будзем разам. Тым жа, хто атрымае павесткі ўжо праз некалькі месяцаў, хачу параіць: не бегайце ад войска. Навошта ўсе гэтыя сумнеўныя прыгоды?

Прысягу байцы прымуць 15 снежня. Тады ж яны адправяцца ў сваё першае звальненне. Але ўжо цяпер ім паказалі, чаму іх навучаць у спецназе. Гэта было майстэрства валодання зброяй і элементы рукапашнага бою. Адзінае — гэтыя спецназаўцы паўгода таму таксама стаялі на пляцы, чакаючы адпраўкі...

«Ухілістаў» ад прызыву зараз у Беларусі налічваецца каля 300 чалавек. Іх своечасова апавясцілі аб тым, што трэба прыйсці ў ваенкамат, але своечасова яны туды не прыбылі. Беспакараным гэта не застанецца. Ваенкаматы шукаюць парушальнікаў разам з органамі ўнутраных спраў, каб прыцягнуць да адказнасці. Ім ужо абмежаваны выезд за межы краіны.

30 лістапада заканчваецца восеньскі прызыў — 2018. Пасля гэтага дня матэрыялы па «ўхілістах» будуць перададзены ў тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў. І калі за няяўку па павестцы максімальная штрафная санкцыя складае да пяці базавых велічынь, то за ўхіленне ад прызыву можна атрымаць і да двух гадоў пазбаўлення волі. Таму час абысціся «малой крывёй» яшчэ застаецца.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Змена

ЛЕПШ АДСЛУЖЫЦЬ

Кантрольнай яўцы ў ваенкамат у Беларусі папярэднічае Дзень прызыўніка. Ён праводзіцца ва ўсіх раённых ваенкаматах краіны. Гэты дзень прысвечаны тым, хто ўжо прызнаны годным для службы ў войску, але пакуль яшчэ для яго не надышоў час адпраўкі ў часць.

У Барысаўскім раёне да Дня прызыўніка была падрыхтавана цэлая канцэртная праграма. З цёплымі словамі выступалі прадстаўнікі ДТСААФ, ветэраны, якія дзяліліся сваім вайсковым досведам. Іх уважліва слухала каля сотні юнакоў...

— Я вучыўся на таваразнаўца ў Барысаве, — кажа **прызыўнік Сяргей ГЕРАСІМОЎСКІ.** — Скончыў вучобу, і прыйшла павестка. Крыху хваляваўся, але нічога не зробіш: трэба — значыць, трэба. Медкамісію праходзіў больш за месяц. Прызналі годным абмежавана. Ужо вядома, дзе буду служыць, — ва ўнутраных войсках у Мінску. Прычым самае цікавае, што каго ні распытваў з сяброў, знаёмых, родных — ніхто там пакуль не быў. Служыць мне васямнаццаць месяцаў. Бацькі, праўда, думалі, што застануся служыць у Барысаве, але выбар у мяне быў сціплы: або Бабруйск, або Мінск. Ну, да Мінска хоць бліжэй адсюль.

А вось Ілья Зялінскі, які вучыўся разам з Сяргеем, застанецца ў Барысаве. Ці, дакладней, у Печах, дзе будзе служыць у танкавых войсках. Падчас абследавання хлопец нават правёў некаторы час у бальніцы, але камісія прызнала яго годным.

— Галоўнае — не баяцца, — кажа хлопец. — Чым да 27 гадоў хавацца ад войска, то значна лепш адслужыць. І пасля ўсе дарогі ў жыцці будуць адкрыты.

Начальнік аддзела прызыву на ваенную службу ваеннага камісарыята Барысаўскага і Крупскага раёнаў Мінскай вобласці падпалкоўнік Сяргей КАВАЛЕНКА ўручаў хлопцам павесткі на кантрольную яўку.

— Мы хочам, каб армія не была нейкай terra incognita для маладых людзей, — кажа Сяргей Каваленка. — Псіхалагічны прынцып вельмі просты: палохае менавіта няведанне таго, што чакае наперадзе. А калі ўсё паказаць, растлумачыць, то і цікавасць у юнакоў прачнецца вялікая. Так, ва ўстановы адукацыі прыходзяць ваеннаслужачыя, расказваюць пра сябе. Вучняў 10—11 класаў, якія задумваюцца аб тым, каб набыць ваенную прафесію, мы звазілі на экскурсію ў Ваенную акадэмію. Шмат пытанняў задаюць бацькі. Яны датычацца месца будучай службы, яе ўмоў, медыцынскага абслугоўвання... Мы ніколі ад бацькоў нічога не хавалі і хаваць не будзем. Дапамагае і ўласны досвед: я сам некалькі гадоў быў камандзірам роты.

Большасць барысаўчан далёка ад свайго горада не адпраўляюцца, а служаць у 72-м аб'яднаным вучэбным цэнтры. Гэта пераважна маладыя людзі, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. У такім выпадку тэрмін службы для іх складае паўтара года.

— Адметна, што з часам усё меней становіцца «ўхілістаў». Зараз яны складаюць долі працэнта ад агульнай колькасці прызыўнікоў. Суд у большасці выпадкаў выносіць пастанову аб велізарным штрафе. І калі судзімасць здымаецца і гасіцца, то хлопца зноў чакае выклік на медыцынскае асведчанне. Былі нават у нас выпадкі, калі тыя, хто быў асуджаны за ўхіленне, пасля былі прызваны і адпраўлены ў войска. Я асабіста пытаўся ў іх: ну і навошта патрэбны былі ўсе гэтыя прыгоды? Многія адказваюць, што не ведалі, баяліся. І гэта яшчэ адзін доказ таго, што пра воінскую службу трэба юнакам расказваць яшчэ да таго, як прыйдзе павестка ў ваенкамат.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Тэма

АЛЬБОМ ДЛЯ «ДЭМБЕЛЯ»

Чым армейская традыцыя можа стаць карыснай для гісторыі?

Пік моды на дэмбельскія альбомы прыйшоўся на 70—80-е гады мінулага стагоддзя. Але нядаўна пра іх зноў гучна загаварылі. І на гэты раз дзякуючы не дэмбелям, а фотамастакам з Магілёва і Мінска. Яны стварылі праект з аднайменнай назвай і прадэманстравалі грамадскасці, што з гэтага атрымалася. Выстаўка дэмбельскіх фотаальбомаў прайшла ў магілёўскім этнаграфічным музеі на ўра. І спецыялісты ўсур'ёз прадракаюць, што армейская фотахроніка з часам можа ператварыцца ў сапраўдны від мастацтва.

САВЕЦКІ ХЭНД-МЭЙД

Выстаўку рыхтавалі сумеснымі намаганнямі фотамастакі сталічнага і магілёўскага народных фотаклубаў «Мінск» і «Вясёлка», а таксама народнай «Студыі 3plus» з Магілёва. А каардынавала іх дзеянні магілёўскі фотамайстар Ірына Савосіна.

— Мы не маглі не звярнуцца да салдацкай тэматыкі, паколькі ўсё навокал уяўляе для нас цікавасць, — кажа яна. — Я памятаю сваіх старэйшых таварышаў з Магілёва, такіх як Зіновій Шэгельман і Павел Цішкоўскі, якія ў 70—80-е гады праводзілі шмат розных выставак, запрашалі калег з усяго Савецкага Саюза. Інтэрнэту не было, таму людзі сустракаліся, хадзілі разам на здымкі, рабілі выстаўкі. Гэта было добрай школай, сапраўднай фотаграфічнай акадэміяй. Гучала і крытыка, чуць якую не заўсёды было прыемна, але гэта прымушала вучыцца і расці прафесійна. Дзякуючы гэтаму захавалася шмат карыснага матэрыялу, прысвечанага вузкім бакам нашага жыцця. Тая школа шмат чаго дала, і засталося жаданне гэта працягваць. Зараз у нас моцныя стасункі з фотаклубам з Мінска, мы прывозім да іх нейкія праекты, экспазіцыі. Аднойчы ў кулуарах загаварылі пра ваеннае фота і дэмбельскія альбомы. І я зачапілася за ідэю, чаму б не зрабіць такі праект «Дэмбельскі альбом». Так, гэта фота няякаснае, аматарскае, зробленае дзесьці тайком у шафе, але ўсё роўна гэта вялікі кавалак жыцця людзей, цэлая геаграфія ад Далёкага Усходу і да Калінінграда, ад Кубы да Афганістана. І справа пайшла. Спачатку альбомамі падзяліліся мае калегі, і ўжо сёлета, 23 лютага, у Мінску была зроблена першая выстаўка. Атрымалася вельмі цікава. І вырашана было пашырыць межы. У Магілёве ў экспазіцыю трапілі альбомы яшчэ і звычайных гараджан.

А колькі розных цікавых гісторый усплыло на паверхню. Напрыклад, пра тое, як адносіліся да армейскіх фотаальбомаў у 60-я гады, аказалася, што не ўсе іх і рабілі. Знакаміты магілёўскі фотамайстар Георгій Дондзік служыў на флоце ў Калінінградскай вобласці, а потым іх, прызыўнікоў, тэрмінова накіравалі на Кубу. Гэта быў перыяд карыбскага крызісу 1962 года, калі абвастрылася супрацьстаянне паміж СССР і ЗША. Зразумела, што ў тых умовах ні пра якія альбомы і размовы не магло ісці. Але ж фота засталіся. І потым ужо праз гады дочкі занатавалі ўспаміны бацькі і ўклеілі ў фотаальбом яго армейскія здымкі. Жывы прыклад таго, што калі не шырокай грамадскасці, то для сям'і такія рэчы вельмі патрэбныя.

Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

Анатоль ТАЛКАЧОЎ, Ірына САВОСІНА і Мірон ШЧУДЛО (злева направа) падчас работы над праектам.

На сустрэчу Ірына Савосіна прынесла фотаальбом Міхаіла Краснапольскага з Быхаўскага раёна, які, на жаль, ужо памёр. Але пляменнік не выкінуў гэтую памяць пра свайго дзядзьку. Бярэш у рукі армейскі «фаліянт» і пераносішся на паўстагоддзя назад. І нікога ж тады не бянтэжылі руковыя ружачкі на старонках, наіўныя малюнкі з рамантычнымі пейзажамі, пафасныя подпісы. Але ёсць дэталі, якія і зараз захапляюць. Чаго толькі варта адна чаканка, зробленая ў стылі моднага сёння хэнд-мэйду. Альбом Міхаіла не перацягнуты аксамітам, як гэта часта рабілася ў армейскім асяроддзі, але нейкія агульныя каноны захаваліся — тыя ж малюнкі, паштоўкі з відамі горада — усё, што перадавала тую атмасферу.

ЯК ПЕРАБЛЫТАЛІ ГОЛАЦК І ПОЛАЦК

Быў свой дэмбельскі альбом і ў Мірона Шчудло, яшчэ аднаго магілёўскага фотамайстра. Але, смяецца, жыццё яго так пакідала, што альбом прыйшлося разабраць і пакінуць на памяць адны фотакарткі.

У армію ён пайшоў служыць у 1965 годзе, якраз перад Новым годам. Прыгадвае, што спачатку яго накіравалі ва Узбекістан, а потым ужо ў Беларусь. Пакуль ехаў на цягніку, маляваў узбекам русалак на цыферблатах гадзіннікаў. Вельмі ім гэта падабалася. У вайсковай часці яго творчым схільнасцям хутка знайшлі прымяненне. Загадалі аформіць музей, намаляваць партрэты 77 Герояў Савецкага Саюза! І Мірон хутка справіўся. 23 лютага музей ужо адкрылі. Старанні былі ацэнены па заслугах, салдата, які толькі два месяцы таму прызваўся ў армію, заахвоцілі водпускам на радзіму.

Аднойчы яму пашчасціла правесці экскурсію па музеі для самога маршала авіяцыі, Героя Савецкага Саюза Сяргея Рудэнкі. Непрыкметна перайшлі на бытавыя тэмы. Маршал спытаўся пра бацькоў, і хлопец уздыхнуў, што дома яго чакае хворая маці, што ёсць праблемы з дровамі на зіму, зямельным участкам. А праз нейкі час пасля гэтага атрымлівае гнеўны ліст ад маці, маўляў, навошта скардзіўся, цяпер ад увагі мясцовых улад схавацца няма куды.

У армейскай гісторыі Мірона Шчудло наогул шмат цікавых выпадкаў. Аднойчы ён нават стварыў сапраўдны перапалох у радах доблесных савецкіх ваенна-паветраных сіл.

— У штабе я чарціў розныя схемы, карты. Аднойчы перад вучэннямі далі заданне зрабіць схемы вучэнняў, графічна паказаць, які полк куды ляціць. Начальнік штаба напісаў назвы населеных пунктаў ад рукі і я прачытаў назву Голацк (ёсць такая вёска ў Віцебскай вобласці) як Полацк. І ўвесь пастаўскі полк адным узмахам рукі адправіў у Полацк на вучэнні. Начальнік штаба памылку не ўбачыў, усё гэта падпісаў і разаслаў. Пачаліся вучэнні, і ўвесь полк рушыў на Полацк. Хутка, праўда, схамянуліся, што нешта не так, пачаўся скандал. У выніку палкоўніка на паўгода разжалавалі ў маёры.

Тады ж у арміі ў хлопца адбылося і першае знаёмства з фотаапаратам. Разам з таварышам па службе, у якога такі апарат быў, адправіліся на здымкі. Мірон вельмі стараўся, пазіраваў, залазіў на дрэвы. Здымкі абяцалі быць цікавымі, але ў нейкі момант плёнка заела. Фатограф-пачатковец упэўнена адкрыў крышку, крыху яе пасунуў і пайшоў далей здымаць. І нікому няўцям, што плёнка ўжо засвечаная напалову.

З нюансамі стварэння дэмбельскіх так званых кніг памяці Мірон Шчудло знаёмы вельмі добра, бо сам намёртва «ўманціраваў» у альбом сталярным клеем армейскія здымкі. Ададраць іх адтуль ужо было не магчыма, хіба што толькі выразаць разам са старонкай. Але іншага клею не было, прыходзілася карыстацца тым, што ёсць. А свабодную ад здымкаў плошчу дамалёўвалі карцінкамі пра любоў, усміхаецца суразмоўнік.

— З фота тады адчувалася напружанне, бывала, што і салдат з натуры маляваў, — кажа ён. — А ў маім альбоме меліся нават выразкі з газеты, бо пра маю музейную справу ў цэнтральнай прэсе пісалі. Абгортку для альбома зрабіў драўляную і пакрыў лакам. А вось таварышы абцягвалі вокладку аксамітавай тканінай. У каго тканіны не было, зразалі тайком з казённых крэслаў: для альбома шукалі толькі самае лепшае.

Ад дэмбельскага альбома Мірон Шчудло пакінуў толькі фотакарткі.

Ружовыя ружачкі ў дэмбельскім альбоме нікога раней не бянтэжылі. Наадварот, нагадвалі пра «гражданку» (з альбома Віталія Апашнюка).

ФАТОГРАФ ЯК ЗНАХОДКА ДЛЯ ЧАСЦІ

Анатоль Талкачоў службу праходзіў у элітных войсках — у Пскоўскай паветрана-дэсантнай дывізіі. І было гэта ў 1966—1968 гадах. На той час ён быў ужо нядрэнным фатографам і лічыў, што ўсе гэтыя дэмбельскія альбомы — кіч, таму рабіць сабе не стаў. Але гэта не перашкодзіла яму захаваць нават па сённяшніх часах шэдэўральныя фота. Тут і якасць, і сюжэт цікавы. Чаго варты толькі здымак скачкоў з самалёта, калі ў паветры адначасова знаходзіцца да ста парашутыстаў. Па цяперашніх часах — проста неймаверная колькасць.

— Калі высветлілася, што я ўмею фатаграфаваць і нават маляваць, мне ў арміі адразу ж уручылі ў рукі на той час вельмі перадавы люстраны фотаапарат, — прыгадвае Анатоль. — А яшчэ ўсклалі абавязкі па маляванні і паштовых паслугах. Я быў самы жаданы для салдат чалавек, бо за час сваёй службы перанасіў ім безліч лістоў і грашовых пераводаў.

Фатограф быў паважаны чалавек нават сярод афіцэраў. Намеснік камандзіра па строі, вельмі строгі палкоўнік, якога баяліся нават калегі, прызвычаіўся хадзіць да салдата праяўляць плёнкі. На рэактывы і іншыя неабходныя дробязі грошай не шкадаваў. Здымаў жа ён актыўна і рэгулярна. Аднойчы да Анатоля завітаў таварыш, хлопец страціў пільнасць, адкрыў бачок для праявы, і палкоўніцкая плёнка засвяцілася. За такое можна было і на гаўптвахту трапіць. Але знаходлівы баец сказаў палкоўніку, што вада скончылася і, пакуль ён бегаў за ёй, плёнка пачарнела. Было відаць, што афіцэр нешта падазрае, але зразумець, дзе яго падманваюць, не можа. Усё абышлося, але паслугамі Анатоля палкоўнік больш не карыстаўся.

А ў салдата з'явіўся новы «сябра» — намеснік камандзіра дывізіі па процівапаветранай абароне.

— Ксераксаў тады не было, прыходзілася ўсё маляваць уручную. Нават сакрэтныя рэчы, — расказвае суразмоўнік. — Аднойчы спатрэбілася намаляваць схему для стрэльбаў: дзе пушкі стаяць, як ляціць самалёт і гэтак далей. І так 12 задач. Малюю 12 схем, здымаю і друкую, колькі трэба. У выніку на вучэннях, пакуль іншыя разбіраліся, што і як, мы ўжо адстраляліся і адпачывалі.

Салдаты па «паслугі» Анатоля звярталіся не часта. «Павальнай эпідэміі на дэмбельскія альбомы тады наогул не было, — удакладняе ён. — Ды і несур'ёзна гэта ўсё, думалася тады. Мае здымкі друкаваліся ў газетах, і гэта была досыць высокая планка. І толькі нядаўна я ўсё ж такі зрабіў сабе дэмбельскі альбом. З арміі засталося шмат негатываў, вырашыў крыху навесці парадак у архівах. Зрабіў, і самому спадабалася. Успаміны так і нахлынулі...

P. S.

Ірына Савосіна разам з уражаннямі ад дэмбельскіх альбомаў атрымала такі багаж армейскіх баек, што ў самы раз і кніжку пісаць. А можа, калі-небудзь яна гэта і зробіць? Выданне, можна не сумнявацца, пойдзе на ўра.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Загад аб звальненні, паштоўка з відам горада, таварышы па службе — гэта тыя каноны, якім адпавядаў дэмбельскі альбом (у дадзеным выпадку Аляксандра Ліціна).

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению открытого акционерного общества «Тимирязевский» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: административное здание общей площадью 209,3 кв. м, инв. № 642/С-35911, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622881701601000063 (право аренды по 04.03.2048), площадью 0,1559 га, по адресу: Минская область, Копыльский район, Бучатинский с/с, д. Смоличи.

Начальная цена с НДС – **16 800,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **1 680,00** бел. руб.

Лот № 2: пожарное депо общей площадью 214,4 кв. м, инв. № 642/С-11931, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622881701601000063 (право постоянного пользования), площадью 0,3054 га, по адресу: Минская область, Копыльский район, Бучатинский с/с, д. Гулевичи.

Начальная цена с НДС – **15 095,05** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены – **1 509,00** бел. руб.

Условия продажи:

– улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка, в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

– поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

– обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

– разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

– проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

– использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

– запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию;

– введение объекта в эксплуатацию в течение одного года после заключения договора купли-продажи;

– регистрация юридического лица;

– создание не менее двух рабочих мест.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **28.12.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.12.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агат-электромеханический завод»

Лот №1, состав: 1. Главный корпус, инв. № 600/С-120425. Здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей. Г. п. – 1989. Площадь – 3844,4 кв. м. 2. 2. Иное имущество (полный перечень приведен на сайте Организатора аукциона ino.by). Адрес: Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, район д. Ждановичи.

Начальная цена продажи, доллары США – 1 960 032,35 с НДС. Задаток, – 206 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %

Земельный участок: 1. Земельный участок площадью 1,6797 га, кадастровый номер 623681700001000272. Право постоянного пользования. На земельном участке находятся иные объекты, не выставляемые на аукцион. 2. Земельный участок площадью 0,5822 га с кадастровым номером 623681700001000271. Право постоянного пользования.
Переход права на земельные участки осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Обременения: часть кровли капитального строения с инвентарным номером 600/С-120425 сдается по договорам аренды: 34,4 кв. м – неопределенный срок; 14,0 кв. м – неопределенный срок. Иное имущество, не включенное в состав Лота, будет вывезено в течение 30 дней с момента заключения договора купли-продажи

Условия аукциона: 1. Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота № 1 в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Допускается досрочное заключение договора.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота № 1: 100 % предоплата в течение 5 (пяти) банковских дней после подписания протокола о результатах аукциона на расчетный счет ОАО «Агат-электромеханический завод». Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.
3. Имущество, не входящее в состав Лота № 1 будет вывезено ОАО «Агат – электромеханический завод» в течение от 30 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Лота № 1.
4. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 0,5 % от цены продажи Лота № 1 в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Валюта платежа – белорусский рубль по курсу Национального банка Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона.
5.Обязанность по оформлению, всех документов для заключения сделки купли-продажи Объекта, а также оплата расходов, связанных с оформлением сделки возлагаются на Победителя аукциона (Претендента на покупку).
6. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

Аукцион состоится 26.12.2018 в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Агат-электромеханический завод» 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 117, корпус 3, к. 23, тел. 8 (017) 267-62-92.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 9, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агат-электромеханический завод», проводимом 26.12.2018 г. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д.11, 3 этаж, каб. 7. Окончание приема заявлений: 21.12.2018 в 11.00. Контактное лицо для осмотра Объекта: Короляш Виктор Эдуардович, тел.: 8 (017) 267-62-92, 8 (029) 199-10-49, 8 (029) 501-86-30

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

26 декабря 2018 г. ИЗВЕЩЕНИЕ №18-А/2018
о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение	Наличие ограничений	Срок аренды, (лет)	Начальная стоимость, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на подготовку документации, руб.
1	Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 149 по генплану)	340100000008002224	0,0840	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; обременения: следы проведения земельных работ (отвалов грунта, котлован)	99	5 779,20	200,00	2 804,80
2	Район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 455 по генплану)	340100000008002665	0,0810		Охранная зона линий связи и радиофикации, сетей и сооружений канализации; обременения: следы проведения земельных работ по устройству фундамента (земельные отвалы, котлован)	99	5 572,80	200,00	2 750,50
3	По ул. Свиридова (район жилых домов № 77, 81)	340100000002006176	0,0035	Для размещения легкотипного торгового павильона	Охранная зона объектов газораспределительной системы	5	352,13	20,00	2 970,25

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. № 3–6, № 3–14).
3. **Аукцион состоится 26 декабря 2018 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк», г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах) – это только для физических лиц. Индивидуальные предприниматели и юридические лица производят оплату задатка со своего расчетного счета.

Необходимые документы:

4.1 граждане – копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 24 ноября по 22 декабря 2018 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3–6, 3–14**

Контактный телефон +375 232 41 97 86. Информация размещена на сайте: www.gomel.gov.by либо geodezcentr.by

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53

Здание механизированной мойки, инв. номер 350/С-163612, об. пл. 127,3 кв. м. Составные части: кирпичная пристройка, смотровая яма, очистные сооружения.
КПП стоянки автотранспорта, инв. номер 350/С-163639, об. пл. 53,2 кв. м.
Навес со смотровой ямой (мехмойка), инв. номер 350/С-163641, 76 кв. м. смот. яма.
Очистные замазученных и ливневых вод, инв. номер 350/С-170152. Составные части: закрытый горизонтальный отстойник.
Дорожное покрытие, инв. номер 350/С-170155.
Забор, инв. номер 350/С-170153, об. пл. 386 м. Составные части: 4 ограждения, ворота.
Тепловая сеть, инв. номер 350/С-163618, протяж. 148,9 м. Составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец (1 шт.).
Производственный водопровод, инв. номер 350/С-163611, 213,3 м. Составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.).
Дождевая канализация, инв. номер 350/С-163609, протяж. 234,3 м. Составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприемник

Сведения о земельном участке: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989** га на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов

Начальная цена с НДС 20 % – 405 487,51 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 24.01.2018**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 28.12.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 26.12.2018 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029-317-95-42, www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств» объявляет конкурс на замещение следующих должностей:

• кафедра менеджмента социально-культурной деятельности, старший преподаватель (2);
• кафедра менеджмента социально-культурной деятельности, доцент;
• кафедра менеджмента социально-культурной деятельности, профессор;
• кафедра менеджмента социально-культурной деятельности, преподаватель (2);
• кафедра искусства эстрады, преподаватель (3);
• кафедра искусства эстрады, старший преподаватель(2);
• кафедра хореографии, преподаватель (4);
• кафедра хореографии, старший преподаватель;
• кафедра культурологии и психолого-педагогических дисциплин, доцент (2);
• кафедра культурологии и психолого-педагогических дисциплин, старший преподаватель;
• кафедра режиссуры, старший преподаватель;
• кафедра режиссуры, доцент;
• кафедра режиссуры, заведующий кафедрой;
• кафедра режиссуры, преподаватель (2);
• кафедра народно-инструментального творчества, преподаватель;
• кафедра русского языка как иностранного, преподаватель (7);
• кафедра русского языка как иностранного, старший преподаватель (5);
• кафедра русского языка как иностранного, доцент;
• кафедра библиотечно-информационной деятельности, заведующий кафедрой;
• кафедра библиотечно-информационной деятельности, профессор;
• кафедра информационных ресурсов и коммуникаций, заведующий кафедрой;
• кафедра информационных ресурсов и коммуникаций, старший преподаватель;
• кафедра белорусской и мировой художественной культуры, профессор;
• кафедра белорусской и мировой художественной культуры, доцент;
• кафедра народного декоративно-прикладного искусства, доцент;
• кафедра народного декоративно-прикладного искусства, старший преподаватель;
• кафедра теории музыки и музыкального образования, заведующий кафедрой;
• кафедра белорусского народно-песенного творчества, преподаватель;
• кафедра философии и методологии гуманитарных наук, профессор;
• кафедра духовой музыки, профессор;
• кафедра духовой музыки, старший преподаватель (2);
• кафедра белорусской и зарубежной филологии, старший преподаватель (2);
• кафедра межкультурных коммуникаций, заведующий кафедрой;
• кафедра межкультурных коммуникаций, преподаватель;
• кафедра хорового и вокального искусства, преподаватель;
• кафедра теории музыки и музыкального образования, доцент;
• кафедра психологии и педагогики, преподаватель;

Наш адрес: 220007, г. Минск, ул. Рабкоровская, 17, отдел правовой и кадровой работы, каб. 6. Контактный телефон: (017) 2280023

БЕЗ СТРАХУ І ПАПРОКУ

Некалькі гадзін на дзяжурстве ў раддоме правялі карэспандэнты «Звязды»

Роды — для кожнай жанчыны працэс узрушальны, калі не сказаць палохаючы. Шматлікія форумы ў інтэрнэце, расказы сябровак і легенды не дадаюць душэўнага спакою. Мы наведалі адзін з самых вялікіх і сучасных сталічных раддамоў у выхадны дзень і ўпэўніліся, што нараджаць у нядзелю гэтак жа бяспечна, як і ў любы працоўны дзень. Без кваліфікаванай дапамогі вы не застаняцеся дакладна. Магчыма, нехта, пачытаўшы наш рэпартаж, пазбавіцца хаця б ад аднаго з міфічных уяўленняў пра роды.

...За ноч у сталіцы выпаў невялікі снег, на вуліцах нешматлюдна, і, здаецца, вялікі горад не спяшаецца прачынацца — як-ніяк, выхадны. Мы ж накіроўваемся туды, дзе жыццё не замірае ні днём, ні ўначы, больш за тое, тут кожныя суткі нараджаецца некалькі дзясяткаў новых жыццяў. У фае 5-га сталічнага раддома — пакуль ніводнага наведвальніка. На гадзінніку 10 раніцы. Нас сустракае **адказны дзяжурны акушэр-гінеколаг Ірына КУХТА** *(на фота)*. Яе сённяшняя змена пачалася ў 8.30 і скончыцца а палове на дзявятую вечара. У гэты час Ірына Станіславаўна адказвае за ўсё, што адбываецца ў аддзяленнях раддома: удзельнічае ў кансіліумах і аперацыях, пад яе кантролем знаходзяцца ўсе радзільныя залы, яна нясе адказнасць за экстранную дапамогу, у тым ліку і ў аддзяленні вострых гінекалагічных хвароб, куды ў выхадныя і святочныя дні прывозяць з вострымі паталогіямі жанчын з усяго Мінска. Менавіта да яе, як да самага кваліфікаванага і вопытнага ўрача змены, звяртаюцца па параду ўсе дванаццаць дактароў, якія ў гэты час дзяжураць у розных аддзяленнях.

Радзільны дом № 5 здадзены ў снежні 2015 года. Новы 9-павярховы будынак адбудаваны з «нуля» замест старога 3-павярховага. Калі раней тут прымалі да 3,5 тысячы родаў у год, то летась — 5565. У старым будынку пасля родаў жанчыны размяшчаліся ў 6-7-месных палатах, цяпер яны разлічаны на 1-3 чалавек.

— У родах зараз знаходзіцца чатыры жанчыны. Сёння рыхтуецца адна аперацыя: будзем рабіць кесарава сячэнне пацыентцы, якая знаходзіцца ў аддзяленні рэанімацыі з умеранай прээмплаксіяй (ускладненне цяжарнасці, якое характарызуецца павышаным ціскам, ацёкамі, наяўнасцю бялку ў мачы), — адразу ўводзіць у курс справы Ірына Станіславаўна, але адмаўляецца спрагназаваць, якім чакаецца дзяжурства: — Бывае, і 20 родаў прымеш і ўсё пройдзе спакойна, а здараецца, што адна пацыентка такая цяжкая, што ўсю змену ад яе не адыходзіш.

Роды па-новаму

Урач і акушэр прыёмнага пакоя, з якога пачынаецца шлях у раддом кожнай жанчыны, пакуль свабодныя, з пачатку іх змены сюды ніхто не паступіў: большасць дзяцей, паводле назіранняў медыкаў, для з'яўлення на свет выбіраюць ноч. Паднімаемся ў родавае аддзяленне. Тут размешчаны палаты і радзалы для жанчын без інфекцыйных ускладненняў. Зараз у аддзяленні тры жанчыны. На пасту — столькі ж акушэрак. Кожная з іх сочыць па відэаманіторах за сваёй падапечнай. У раддоме працуе сістэма «адны роды — адна акушэрка», калі жанчыне дапамагае адзін і той жа спецыяліст. Яны зрываюцца з месца, калі некаму з пацыентак патрэбна дапамога. З лета гэтага года раддом працуе па новай сістэме: жанчына на працягу ўсяго перыяду родаў і дзве гадзіны пасля іх знаходзіцца ў адной радзільнай палаце — менавіта так рэкамендуе Сусветная арганізацыя аховы здароўя.

— Жанчыны ні на хвіліну не застаюцца без нагляду, хоць яны гэтага, магчыма, і не ведаюць, думаюць, што іх пакідаюць. Відэа з кожнай палаты, радзалы і аперацыйнай выводзіцца на маніторы на акушэрскім пасту. А паказчыкі КТГ плода выводзяцца на мой манітор у ардынатарскую, — знаёміць з сучаснымі тэхналогіямі **акушэр-гінеколаг родавага аддзялення Ганна ГАДЗЯЕВА.**

Ірына Кухта тлумачыць, што згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, калі роды праходзяць фізіялагічна, патрэбы ў абязбольванні няма. І ўсё больш жанчын свядома адмаўляюцца ад анестэзіі. Аднак калі пацыентка просіць абязболіць, урачы ідуць насустрач яе пажаданням. Адзін з варыянтаў — эпідуральная ці спінальная анестэзія, такім метадам карыстаюцца і ў еўрапейскіх клініках.

— Мы практыкуем адтэрміnаванае перацісканне пупавіны, — працягвае расказваць пра сучасныя падыходы да родаў Ірына Станіславаўна. — Калі дзіця нараджаецца, не перасякаючы пупавіны, мы выкладваем яго на жывот маці, накрываем коўдрачкай і даем крыху паляжаць. Першы кантакт немаўляці з мамай «скура да скуры» вельмі важны. Так яно сустракаецца з той флорай, якая будзе яго суправаджаць і далей, дома. Праз 1,5-2 хвіліны пупавіну перасякаем. Калі гэта партнёрскія роды і праводзіцца кесарава сячэнне, яшчэ ў аперацыйнай дзіця прыкладаем да грудзей мамы, а затым перадаём на рукі тату.

Партнёрскіх родаў, дарэчы, у радзільным доме з кожным годам усё больш. Летась іх было паўтысячы, сёлета медыкі ўпэўнены, што лічба атрымаецца яшчэ большай.

— Ва ўсіх цывілізаваных краінах свету роды пераважна партнёрскія. Незалежна ад таго, каго хоча бачыць жанчына сярод сваіх партнёраў — мужа, маму, сястру, сяброўку, — яна мае на гэта права. Колькасць такіх родаў у нас таксама павялічваецца. Асабіста я іх вельмі люблю, — прызнаецца Ірына Кухта. — Для кожнай жанчыны роды — стрэсавая сітуацыя. Таму, калі ёсць чалавек, якому яна давярае і які яе падтрымлівае, гэта вельмі важна. І партнёр павінен прыходзіць, каб падтрымаць жанчыну ў родах, а не ад кагосьці яе абараняць.

...Надзея і Аляксандр *(на фота)* усяго два дні таму сталі бацькамі. Да з'яўлення на свет першынца абодва паставіліся адказна: загадзя вырашылі, што роды будуць партнёрскія, разам наведвалі курсы.

— Памятаю, я прабег Мінскі паўмарафон, памыўся і пераадзеўся ў прыбіральні гандлёвага цэнтра, і мы разам з Надзеяй паехалі на курсы, — расказвае Аляксандр. Надзея дадае: — Для нас партнёрскія роды — не нейкі мэйнстрым, а ўсвядомлены выбар. Падтрымка мужа прыйшлася вельмі дарэчы. Напрыклад, давялося павучыцца сінхронна дыхаць, але гэта мне вельмі дапамагала падчас родаў.

Дарэчы, да выбару раддома маладая сям'я таксама паставілася сур'ёзна: чыталі водгукі, улічвалі магчымасці дародавага абследавання і ўмовы ў пасляродавых палатах.

— Сын, дарэчы, нарадзіўся якраз у дзень нашага знаёмства, толькі праз чатыры гады, — з гонарам кажа малады бацька. — А пачуцці ад яго нараджэння можна параўнаць хіба з адчуваннямі пасля паўмарафону.

Ніна Сяргееўна нарадзілася!

Пакуль да запланаванай на 12 гадзін аперацыі яшчэ застаецца час, ідзём туды, дзе ўсё самае ўзрушальнае яшчэ наперадзе: Ірына Станіславаўна праводзіць нас у «сваё» аддзяленне — паталогіі цяжарнасці. Тут знаходзяцца жанчыны на розных тэрмінах, якія маюць патрэбу ў кантролі спецыялістаў. Дзве будучыя мамы — Наталля і Кацярына — трапілі ў стацыянар на позніх тэрмінах і жартуюць, што «цяжарнымі адсюль ужо не выйдуць». Умовы ў раддоме называюць выдатнымі, а рэжым — санаторным, што дапамагае падрыхтавацца да родаў і маральна, і фізічна.

— Тут выдатная зала лячэбнай фізкультуры. У будныя дні мы займаемся з інструктарам: выконваем практыкаванні на фітболе, вучымся правільнаму дыханню, што спатрэбіцца падчас родаў, — расказвае Наталля. — Нас адразу прывялі ў тонус: пасля тыдня заняткаў адчуваеш сябе не ляжачым хворым, а здаровым актыўным чалавекам, — усміхаецца Наталля.

Дарэчы, фітболы маюцца ў перадродавых і родавых палатах — жанчына можа скарыстацца адным з іх для аблягчэння болю. У раддоме прыняты свабодныя паводзіны падчас родаў: дазваляецца хадзіць, сядзець, выконваць практыкаванні — усё, што пажадае будучая мама.

Перад аперацыяй (кесарава сячэнне, нагадаем, будуць рабіць жанчыне з умеранай прээмплаксіяй на 36-м тыдні цяжарнасці, стан жанчыны не дазваляе далей выношваць дзіця) Ірына Станіславаўна

Падчас аперацыі.

дае апошнія рэкамендацыі персаналу ў родавым аддзяленні: асаблівую ўвагу — паказчыкам КТГ, адной з жанчын зрабіць ін'екцыю. У аперацыі задзейнічана брыгада анестэзіёлагаў-рэаніматолагаў, два акушэры-гінеколагі, урач-неанатолаг, аперацыйная медсястра, акушэрка, а таксама брыгада дзіцячай рэанімацыі, паколькі дзіця неданошанае і іх дапамога можа спатрэбіцца. Жанчыну прывозяць да аперацыйнай, ад хвалявання — на твары слёзы. Праз дзясятак хвілін іх зменяць слёзы радасці.

— Ніна Сяргееўна нарадзілася, — вымавіла шчаслівая жанчына, калі ўрачы паведамляюць, што ў яе дзяўчынка.

Аперацыя доўжылася 28 хвілін, і пасля жанчыну зноў накіроўваюць у рэанімацыю — пад апеку дзяжурнага анестэзіёлага-рэаніматолага Аляксея Дубовіка, дзе яна прабудзе яшчэ пэўны час. А вось Ніну Сяргееўну (нягледзячы на вагу 2500 грамаў, дзяўчынка абсалютна здаровая) пасля неабходных працэдур дастаўляюць у палату інтэнсіўнай тэрапіі пад нагляд доктара Марыны Зуевай. Тут знаходзяцца дзеткі, якія маюць патрэбу ў назіранні ці лячэбных працэдурах — у прыватнасці з жаўтухай нованароджаных, адмоўным рэзус-фактарам маці, неданошаныя. Пры неабходнасці яны знаходзяцца тут пастаянна некалькі дзён, некаторых адразу пасля правядзення лячэбных працэдур вяртаюць мамам. У любым выпадку жанчыны могуць іх наведваць і карміць. З палат інтэнсіўнай тэрапіі дзетак пры неабходнасці пераводзяць у педыятрычнае аддзяленне — на другі этап выходжвання.

Усё магчымае і нават больш

— Што адчуваеш, калі нараджаецца дзіця? Магчыма, камусьці здаецца, што ў доктара павінна надысці эмацыянальнае выгаранне. На самай справе адчуваеш сябе гэтак жа, як і 20 гадоў таму: гатовы заплакаць ад радасці разам з мамай. Гэта самы прыемны момант у нашай прафесіі. Разам з маладымі мамамі мы зараджаемся станоўчымі эмоцыямі, — прызнаецца Ірына Кухта, якая прысвяціла акушэрству 21 год, 14 з іх яна працуе ў 5-м раддоме. — Вельмі прыемна, што мамы нас не забываюць. Нядаўна са мной звязалася жанчына, у якой нарадзілася неданошанае дзіця вагой усяго 950 грамаў. Мы яго выхадзілі і падгадавалі. Зараз яму ўжо годзік — абсалютна здаровае дзіця. Мама дагэтуль нам вельмі ўдзячная. Калі б давялося выбіраць спецыяльнасць, я зноў яе выбрала б, хоць праца акушэра-гінеколага вельмі складаная. Загадзя ніколі не ведаеш, якой атрымаецца працоўная змена, у колькі вернешся дадому. Урач не зніме пальчаткі і не пойдзе з аперацыйнай, калі скончыўся яго працоўны дзень. Трэба не толькі завяршыць аперацыю, але і прызначыць далейшае лячэнне, паназіраць за станам праапераванай пацыенткі. Самае галоўнае, якой бы складанай ні выдалася змена, — каб мамы і дзеці былі здаровыя. І кожнае дзяжурства стараешся правесці так, каб адчуваць, што ты зрабіў усё магчымае і немагчымае для таго, каб так і было.

У дактароў свае прыкметы, і паводле адной з іх не варта жадаць удалага дзяжурства ці спакойнай ночы, таму на развітанне Ірыне Станіславаўне зычым гэтага толькі ў думках. За суткі, падчас якіх мы пяць гадзін правялі ў радзільным доме, тут з'явілася на свет 13 дзяцей.

У 5-ы раддом трапляюць будучыя мамы, якія адносяцца да яго па тэрытарыяльнай прыкмеце. Таксама нараджаць сюды накіроўваюць жанчын з неўралагічнымі і гінекалагічнымі паталогіямі, у прыватнасці з міёмай вялікіх памераў. А таксама жанчын, у якіх пяць і больш дзяцей. Можна трапіць сюды і на платнай аснове.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Больш фота глядзіце на сайце www.zviazda.by.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 43 (439)

У закрытай прасторы

Біенале тэрмінова патрабуецца піяршчык

ТРЭЦЯЕ ЗА ГОД ПАДСУМАВАННЕ

400 работ ад 250 аўтараў — у Палацы мастацтва 22 лістапада прайшло адкрыццё шостага Беларускага біенале жывапісу, графікі і скульптуры. Тут жа былі названыя пераможцы ў намінацыях «Жывапіс года», «Графіка года» і «Скульптура года». На пляцоўцы пасля «Арт-Мінска» і Восеньскага салона гэта ўжо трэцяе падсумаванне вынікаў мастацкага жыцця краіны за год. З адрозненнямі, канешне: іншы арганізатар, іншы склад шчасліўчыкаў, што трапілі ў выставачную прастору (хаця нейкія аўтары пераскокваюць з адной экспазіцыі ў другую), іншы склад журы, якое выбрала найлепшых.

Першае біенале прайшло ў 2008 годзе і прадставіла публіцы 227 работ і 285 аўтараў з ліку членаў Беларускага саюза мастакоў. З тых часоў у арт-жыцці краіны з'явіўся шэраг у прынцыпе падобных ініцыятыў, што таксама «даюць справаздачу», выбіраюць найлепшых, праходзяць у Палацы мастацтва і пры гэтым не абмяжоўваюць сябе членствам у саюзе.

Біенале — адпачатку цудоўная ідэя. Паказваць публіцы, што сабралася на рахунку аб'яднання, мяркуючы, што яно можа прадстаўляць мастацтва краіны ўвогуле, адкуль і назва, што, з аднаго боку, абсалютна лагічная, бо выстаўка праходзіць раз на два гады, а з другога, адсылае не да чаго-небудзь, а да Венецыянскага біенале.

«Да гэтай падзеі мы рыхтаваліся цэлы год, — сказаў намеснік кіраўніка Беларускага саюза мастакоў Леанід Хобатаў. — Мы спадзяваліся, што яна адбудзецца ў поўным аб'ёме і ў традыцыях, якія мы закладалі дзесяць гадоў таму. Біенале мае дасягненні, рэакцыю і асаблівую гісторыю, гэта важная вяха ў беларускім мастацтве, бо ёсць рэчы, без якіх чалавек не абыходзіцца, і яны вядуць яго ў гэтыя залы. Нам не сорамна казаць пра ўзровень, які мы не заяўляем, а дэманструем. Тут ёсць свае знаходкі, новыя формы і тэндэнцыі. Такі матэрыял не можа знікнуць бясследна, таму што без гэтай часткі культуры краіна не жыве, што мы ўсе цудоўна разумеем».

Работы Уладзіміра Канцэдайлава.

Але каб Беларускае біенале набрала моц, яму патрэбны грошы, піяр-кампанія і адпаведная арганізацыя. Залы Палаца мастацтва настолькі халодныя, што адкрыццё немагчыма было правесці без вопраткі, а вы ўяўляеце, як гэта выглядае. І ўрачыстая частка падвяла: члены журы, што выбіралі пераможцаў, да яе не дайшлі, словы блыталіся, узнагароды не падрыхтаваліся — прызёры проста выходзілі альбо не выходзілі на «сцэну».

І канфлікт інтарэсаў тут назіраецца (а гэта ўвогуле хвароба беларускіх арт-івэнтаў): член журы аказаўся і ў ліку пераможцаў. Прынамсі, склад камісіі — адкрыты. У яе ўвайшлі пераможцы мінулага біенале Андрэй Кошалеў, Андрэй Савіч і Аляксандр Некрашэвіч, вядомы скульптар Канстанцін Селіханаў, старшыня секцыі жывапісу БСМ Уладзімір Ганчарук, народны мастак Уладзімір Тоўсцік, прадстаўнікі Нацыянальнага музея Кацярына Ісафатава і Дзмітрый Салодкі.

Графік Андрэй Басалыга агучыў імёны найлепшых, можна сказаць, літаральна пасля пасяджэння журы. Таму зараз Палац мастацтва цікавы не толькі выстаўкай абраных, але і самімі абранымі. Вось, маўляў, лідары саюза мастакоў, самы выкшталцоны беларускі арт. Праўда, у экспазіцыі наведвальнік убачыць разнастайнасць мастацкіх канцэпцый, а куратарскі падыход да яе структуры — не. Нацюрморты насупраць прысвячэння Рыльке, Генадзь Фалей побач з Зояй Луцэвіч. У выніку біенале хоць і рыхтавалася год, а прадэманстравала больш непадрыхтаванасць, чым падрыхтаванасць. Але каб стаць прадстаўнічым мерапрыемствам, якое б асацыявалася з сезонам і прымушала аматараў мастацтва сябе чакаць, яму патрэбна прынцыпова іншая колькасць увагі хоць бы да подпісаў, гэтым разам неахайных.

Так ці інакш. наведвальнік можа знайсці тут нешта незабыўнае: экспазіцыя біенале будзе працаваць у Палацы да 14 снежня.

У намінацыі «Жывапіс года» першае месца журы прызначыла Уладзіміру Канцэдайлаву, другое — Генадзю Козелу, трэцяе — Станіславу Гурскаму. Ганаровымі дыпломамі адзначаны Алег Ладзісаў, Алена Шлегель, Віталь Герасімаў, Зоя Луцэвіч, Васіль Касцючэнка.

«Графіка года» разбілася на дзве намінацыі. У «Арыгінальнай графіцы» першае месца заняў Аляксандр Некрашэвіч, другое — Антон Баранаў, трэцяе — Валянціна Шоба. Ганаровыя дыпломы былі прызначаны для Зоі Луцэвіч і Уладзіміра Лавецкага. У «Друкаванай графіцы» першае, другое і трэцяе месцы размеркаваліся паміж Юрыем Тарэевым, Андрэем Басалыгам і Марынай Мароз. Дыпломамі журы адзначыла Андрэя Якубава, Ганну Мельнікаву, Вольгу Нікішыну.

У «Скульптуры года» першае месца згодна з меркаваннем журы заслужыла Вольга Орсік, другое — Аляксандр Мінкоў, трэцяе — Аляксандр Шапо. Дыпломы атрымалі Сяргей Сотнікаў, Юрый Пеўнеў, Хрысціна Кулагіна.

Кінакрокі

Дакументальны фільм прасачыў за жыццём бяздомнай жанчыны

Фарбаваць валасы ў грамадскай прыбіральні

Сёлета найлепшым дакументальным фільмам Нацыянальнага конкурсу кінафестывалю «Лістапад» стала работа беларуса з Расіі Руслана Фядотава «Песні для Кіта». Назіранне за вось ужо тры гады бяздомнай, але непасрэднай і жыццярадаснай (хоць насамрэч вельмі стомленай) жанчынай пазначана як супраца Беларусі і Расіі. Магчыма, гэта ўсё ж не найлепшы беларускі дакументальны фільм сезона (і гэта маё асабістае меркаванне), але зменлівасць лёсу пазбавіла яго вартых канкурэнтаў і надала статус «першага». Імем Мінскага міжнароднага кінафестывалю.

Выбраная журы работа ў нейкім сэнсе кантрастуе з яшчэ адной карцінай Руслана Фядотава з праграмы Нацыянальнага конкурсу «Саламанка», якую мы дагэтуль не можам забыць. Два гады таму, створаная ў суаўтарстве з беларускай Аляксандрай Кулак, яна таксама атрымала ўзнагароду «Лістапада» як найлепшы дакументальны фільм беларускай праграмы. Работа на стыку дакументальнага і ігравога кіно чорна-бела і стыльна расказала гісторыю чалавека з рэлігійнай абшчыны менанітаў у Мексіцы.

«Песні для Кіта», знятыя ўжо пад уздзеяннем Марыны Разбежкінай, што ў цітрах значыцца як цьютар/настаўнік, — абсалютна дакументальнае кіно, без эстэтызацыі навакольля, без ігравога складніка, без закадравага голаса, без дакладнага зразумелага сюжэта. Але ў цэнтры яго — таксама фрустраваны чалавек, які знаходзіцца ў кантэксце грамадства і яго ўплываў і марыць пра нешта іншае. Што яшчэ аб'ядноўвае дзве карціны — універсальнае значэнне, пра якія б далёкія ад Беларусі тэрыторыі яны ні расказвалі. Калі «Саламанка» трапляе ў Мексіку, то галоўная гераіня «Песень для Кіта» Рада Свістун — жыхарка Масквы, але месца дзеяння тут — напэўна, наўмысна — сцёртае. Толькі па ледзь бачным Беларускім вакзале і здагадках глядач можа ідэнтыфікаваць горад.

Дык вось, структура фільма да фінальнай яго часткі ўяўляецца замалёўкамі пра жыццё галоўнай гераіні ў розных лакацыях, без тлумачэнняў, асаблівай сувязі паміж эпізодамі, без нейкай звязнай лініі апавядання. Але сутнасць гэтых замалёвак, здаецца, у тым, каб глядач убачыў абсалютную прастадушнасць і весялосць бяздомнай гераіні, больш шчаслівай, чым многія ўладальнікі даху над галавой. І ў канцы зразумеў, што весялосць усё ж — падманлівая штука.

Усё пачынаецца ў грамадскай прыбіральні, дзе Рада фарбуе валасы, мые з мылам плюшавую цацку, крычыць прадстаўніцы, напэўна, адміністрацыі ўстановы, што нічога дрэннага не робіць і хутка выйдзе. Акуратная, непасрэдная, дзяўчынка па паводзінах, Рада ўяўляецца нейкім феноменам, прынамсі для тых, хто не зведаў бяздомнага жыцця. У яе ёсць сябры (здаецца, і каханак), тэлефон, добрае і чыстае адзенне. Яна можа танцаваць на гарадскім свяце і спяваць песні ў метро. Яна ведае, дзе пафарбаваць валасы. Яна смяецца, прычым смех у яе шчыры. Яна трывала прымае незадаволеныя каментарыі, звальненне, злоў на крадзяжы шампуню ў краме і з былой лёгкасцю пераходзіць у новы эпізод. Яна нават можа ўгаварыць лямпачку свяціць, а тэлефон — зараджацца. І выехаць на пікнік за горад, каб пасмажыць танныя сасіскі і запячы бульбу ў вуголлі. Дзень Перамогі яна святкуе так, быццам свой дзень нараджэння ў дарагім рэстаране — радуецца жыццю і ўсё. Адным словам, галоўная гераіня ламае стэрэатыпы пра бяздомных, што мы маем, альбо насамрэч з'яўляецца выключнай басячкай, якая пры ўсёй неўладкаванасці абмінае турботы, захоўваючы лёгкае стаўленне да жыцця.

І вось калі карціна ўжо ўпэўніла гледачоў у асобным радасным сусвеце Рады Свістун, здараецца пранізлівая канцоўка, што надае ўсяму сказанаму бездань сэнсаў з супрацьлеглымі эмоцыямі. Руслан Фядотаў зрабіў вельмі займальны трук, а «Песні для Кіта» — наконт назвы можна толькі прапаноўваць тэорыі — завяршыліся як уважлівы і блізкі да свайго героя падхват асабістага жыцця (часам гэтая блізкасць і «заўважнасць» выклікае асобныя пытанні).

Прэм'ера карціны адбылася на расійскім кінафестывалі «Артдакфэст», які ў свой час адкрыў і «Саламанку». Фільм таксама быў паказаны на найпрэстыжнейшым фестывалі дакументальнага кіно IDFA ў Амстэрдаме. Выдатна, што Руслан Фядотаў — беларус, што самарэалізуецца за мяжой, — змог атрымаць узнагароду на «Лістападзе», а «Лістапад» збірае ў Нацыянальную праграму беларусаў не толькі з Беларусі. Бо надзвычай часта аўтары робяць у іншым месцы тое, чаго не зрабілі б у гэтым. «Саламанка» нашага жыцця.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона

